# *Пры саветах (1939-1941)*

**Адамчук Міхал, Мацьковічы:**

Як насталі бальшавікі, яны ўмацоўвалі граніцу і нам гаварылі:

— Убирайтесь в Россию, там ваша родина.

А мы адказвалі:

— Мы тут жылі, нам Расія незнаёма і мы туды не паедзем.

Бальшавікі гаварылі, што яны па Хрыстовых запаведзях ідуць: „Мы войны не хотим, себя защитим”. У 1940 годзе мяне паслалі на „заготовительный хлебной пункт” у Брэст. Там была школа, для якой трэба было сем класаў польскай пачатковай і адзін клас гімназіі мець. Усё пра рост ізахоўванне збожжа трэба было вывучыць. На ўроку адна дзяўчына з Пружан падказвала мне, я на яе заглядзеўся і настаўніца накінулася на мяне.

— Я маму оставил дома, — адказаў я, — а вы на меня напали. Я всё знаю.

— Ваши ошибки я вам выправлю, — адказала мне і тройку паставіла.

Пасля быў экзамен, тая з Пружан села каля мяне. Пыталі пра вільготнасць, прылады. А прыладамі былі „шведская мельница, канадская лупа, голландская вага” — ці ж саветы свае тэхнікі не мелі? Дзяўчына мне падказвала, а я адказваў. Пасля паклікалі мяне да стала, пытаюць, як даследаваць зерне ў мяшках. Я адказаў не толькі пра гэта, але і як з вагонамі абыходзіцца. Далі мне атэстат, падзякавалі, што я прагрэс уводжу і назначаюць мяне лабарантам у Сямятычы. А жыдоў экзаменатар паабсаджваў і яны дзіваваліся, што мяне, нявучанага, у лабараторыю бяруць, а ім зноў экзамен здаваць.

У Сямятычах стаў я на працу ў склад, які адзін чалавек пабудаваў недалёка станцыі ў 1927 годзе. Даследаваў муку, якую з Украіны прысылалі, ці кляшчоў і іншых паразітаў не было.

У маёнтках у Астражанах і Вяжхуцы арганізавалі саўгасы і жыды агітавалі, каб усё здаваць. Прыехала адтуль шляхта з чырвонымі сцягамі, а я іх пытаю:

— Czego wy w niedzielк jedziecie?

Дачуўся пра такое камісар:

— Кто з заготпункта сказал, чтобы в воскресенье не возить? Его ожидает северная дорога в Вологодскую область!

Але мяне захілілі, ніхто не ўдаў. Затое склад так расцягнулі, такіх недахопаў нарабілі, што загадчыку ад таго сэрца лопнула.

**Андраюк Ян, Трасцянка:**

Як насталі саветы, дык можна было купіць патэфон, радыё, але жыццё нецікавае было. Ганялі нас у лес да вывазкі, у Ізобы — там па тыдні выраблялі план, начавалі ў Татараўцах. У сорак першым годзе, зімою, сталі нас браць гатовіць у армію. Бралі ў Агароднікі, бо там наш сельсавет быў, і навучалі абароны перад газамі і хадзіць па маршрутах. Навесну паставілі нас у Заблудаў, у ваенкамат, на камісію і восенню мелі браць у армію...

**Багацэвіч Галіна, Орля:**

Вярнулі мяне на два класы — у пяты, і зноў стала хадзіць у школу. У саветаў — у Беларускай няпоўнай сярэдняй школе ў Орлі — было больш прадметаў. На месца польскай мовы была, як родная, уведзена беларуская. Увялі таксама замежныя мовы: рускую і нямецкую.

Даведаліся мы, што арыштавалі дубіцкага бацюшку, бо нехта ўдаў. Пачаліся вывазкі ў Сібір. Помню, што рана, на досвітку, калі падаў снег, вывозілі войта Ваньковіча, які жыў насупраць царквы, і загадчыка школы Тадэвуша Врублеўскага з жонкай Марыяй, якая была настаўніцай, ды з дачушкаю і сынком. Мужчын забіралі асобна ад жанчын з дзецьмі. Не трэба было быць багатым каб вывезлі: за багацце ці палітыку не вывозілі. Бо загадчык школы палітыкай не займаўся. На ягоную пасаду саветы прызначылі нейкага нетутэйшага, які нават не ўмеў па-руску гаварыць, але навучаў.

Я нядаўна сустрэла ў шпіталі жанчыну, каталічку, якую таксама былі вывезлі, і яна сказала мне:

— Савет, калі нас вывозіў, сказаў: „Забірайце ўсё, бо там вам спатрэбіцца, гавару вам шчыра. І не злуйце на нас, бо гэта не мы вас вывозім. Гэта вашы суседзі камандуюць нам, хто багаты ці праціўнік улады. Мо хочуць вам адпомсціць, а мо ваша дабро захапіць”. Шкадаваў, што вывозяць, — расказвала тая жанчына і хваліла рускіх, што дапамагалі.

Нашы дзяўчаты, і жыдоўкі таксама, калі прыйшлі ў Орлю „камандзіры”, паляцелі на іх зоркі. Праз тыя пагоны страцілі яны цікавасць да нашых хлопцаў.

**Барысюк Наталля, Андрыянкі:**

Рускіх спярша мо адзін-два было, а пасля больш прыехала. У плябаніі забаву зрабілі, спявалі, а пасля раз'ехаліся. У вёсцы стварылі сельсавет, а яго старшынём назначылі Яна Міхальчука. Людзі баяліся калгасаў, але не ўспелі іх зрабіць. На „белыя мядзведзі" вывезлі адно жонку настаўніка Халюпкі, якая пасля вяртання пасялілася ў Асмолі. Больш нікога не вывезлі: ні з нашай вёскі, ні з суседніх.

У панскім двары стала ваенная часць. Камандзіры жылі на кватэрах у вёсцы, у гаспадароў. Салдаты, вярхом на адным кані, прыводзілі ім другога і так яны даставаліся ў часць. Салдатам нельга было заходзіць у вёску. Аднойчы салдаты з калоны забеглі ў нейкую хату саланінай пачаставацца, то пасля іхняга камандзіра пасадзілі пад варту. І саветы парадачна вялі сябе. А пра залётнікаў адна жанчына сказала:

— Девушки, вы не поглядывайте за военными, бо ещё война не окончена.

У двары, дзе стаяла часць, саветы арганізавалі мітынгі, паказвалі там фільмы. Людзі хадзілі глядзець і я некалькі разоў была з блізкімі.

**Белая Люба, Беласток:**

У 1939 годзе немцаў у нас не было, толькі восенню прыйшлі рускія. Там, дзе цяпер злеўня, браму ім паставілі — такія калочкі з надпісам паміж імі; што там было напісана — не помню. Зышлася туды хіба цэлая вёска, а арганізавалі тое ўсё камуністы, якія іконы ў хатах скідалі; мо з пецярых такіх у Дзернякове было: Карповіч, Храноўскія, а наша сям'я — ні туды, ні сюды.

Наша сям'я з парабкаў была. Прадзеды не мелі дзяцей і ўзялі пару парабкаў, якія з сабою пажаніліся — былі гэта нашы дзяды. Бацькі нашы дакупілі зямлі і ўжо саветы лічылі нашу сям'ю кулакамі. Адзін з нашай вёскі зайшоў на сход у Гарадок, залез на трыбуну і стаў нас абзываць кулакамі. А іншы пачуў гэта і адказаў, што мы з парабкаў і наша сям'я сама настаралася наша дабро. Гаварылі нам, што мы запісаны да вывазкі на ўсход, мы ўжо былі спакаваліся, але ніхто па нас не прыехаў.

З Дзернякова вывезлі дзве сям'і — спярша забіралі мужчын. Адзін быў солтысам, серадняком; калі ён пасля наведваў нашу вёску, гаварыў, што ягоныя найлепшыя сябры падпісаліся, каб вывезці ягоную сям'ю. А другі зусім бедны быў, але з братам у нязгодзе жыў. Зямлі ў нашай вёсцы саветы нікому не забіралі, таксама не арганізавалі калгаса.

Пры санацыі я хадзіла ў школу, якая была ў прыватнай хаце. Пасля, у 1938 годзе, пабудавалі ў нас новую школу. Калі яе здавалі, прыехаў войт і іншыя вышэйшыя чыны. Выступалі старэйшыя вучні, штось гаварылі. І высвянчалі школу, толькі не помню хто — ксёндз ці бацюшка. У тую школу хадзіла я год, а пасля два гады ў рускую. Вучылі ў ёй па-руску. Адзін год вучыў наш вясковец, а потым Кардаш з Меляшкоў. Невядома, якая ў іх была адукацыя, бо на царскую былі яны замаладыя.

**Берасцюк Антон, Шашылы:**

У 1939 годзе прыйшлі рускія; у Шашылах ніхто іх не вітаў, бо наша вёска з краю. Але людзі задаволены былі. Саветы тут ніякай крыўды не рабілі, бо наша вёска бедная была. Былі вызначаны для вывазкі, але не ўспелі і нікога не вывезлі.

Пазней саветы бралі нас крэпасць будаваць. Бралі размаітых, і я трапіў. Жылі ў польскай вёсцы, у гаспадароў; людзі там добрыя былі — дапамагалі нам харчамі, вечарам кармілі нас бульбай і кіслым малаком. І рускія абыходзіліся з намі як з людзьмі, але не кармілі. Калі вызначалі на працу, папярэдзілі, што карміць не будуць, бо ў іх кухня толькі салдатам, і мы бралі ежу з сабою.

Былі там два тыдні, перад касьбою. Завезлі нас самаходамі. Капалі там ямы і тыя далы залівалі бетонам і зверху закідалі зямлёю. Рабілі па дванаццаць гадзін у суткі, спяшаліся. Назад вярталіся пехатою.

Рыхтавалі нас для арміі, трэба было хадзіць на маршыроўкі. Выходзілі з Бельска ў Дзядковічы і вярталіся; хто першы вярнуўся, таму была ўзнагарода, але якая — не помню. Тры разы хадзіў, па нядзелях.

Вазіў таксама каменне ў Бельск, там будавалі аэрадром. Кожнаму вызначалі норму, трэба было ў полі назбіраць кубічны метр камення. Я вазіў тры разы. Апошні раз завёз у суботу, вярнуўся дахаты і заснуў. А ноччу немец пачаў бамбіць. Яшчэ ў нядзелю выбраўся на маршыроўку, зайшоў у Нурэц і вярнуўся.

**Васілеўская Стэфанія, Грабяні-Калёнія:**

У 1939 годзе немцаў у нас не было, адразу рускія прыйшлі. І хто рускі, той сваіх хацеў. А адзін польскі аж здурэў, што рускія прыйшлі — яго ў Мінск забралі і там прапаў. Ніякіх брам прышэльцам не ставілі.

Сельсавет у Новым Двары быў — начальнікаў многа было, а пасля іх павыганялі і яны ў Расію выехалі — у 1945 годзе ў СССР выехала каля дзесяці сем’яў. З Грабянёў выехала толькі адна сям’я, бо нашым ксёндз сказаў, каб аставаліся.

У маёнтку ў Новым Двары калгас быў. Тата з суседам запісаліся ў той калгас, а мама паляцела і выпісала. Начальства там сваё было, тутэйшае. Спярша цяжка было, кулакамі абзывалі. Мой тата дрэва вазіў у Трасцянцы за Саколкай — з лесу не вылазіў. Гаспадарка ў нас вялікая была, мо з сем кароў трымалі. Людзі ж біліся, каб больш мець, а пасля, пры саветах, то і раскідаць сталі. З нашага наваколля саветы нікога не вывозілі, але мая цётка ў Падсудках жонкай гаёвага была, то на „белыя мядзведзі" вывезлі.

Школа была таксама, як і пры Польшчы, у Новым Двары; я туды на вечаровыя курсы хадзіла. Дзве вучыцелькі з Расіі па-руску вучылі. Хаця пры Польшчы мы вучыліся ў Новым Двары, аднак зноў пачыналі ад першага класа, каб па-руску пісаць і чытаць навучыцца. Я пахадзіла адну зіму, а пасля бацькі не пусцілі.

**Гогаль Антаніна, Зачарляны:**

У 1939 годзе немцаў у нас не было — адразу прыйшлі рускія. І тыя, што да вайны канспіравалі — зладзеі, якім не хацелася працаваць — пісалі каго вывезці ў Сібір. Каб саслалі, трэба было тры подпісы; нашу сям'ю падаў Юзаф Матэйчук.

13 красавіка 1940 года ў пяць гадзін раніцы вайсковыя застукалі ў наша акно:

— Открой!

Я ўпусціла іх.

— Идём в комнату. Собирайтесь, мы вас перемещаем с этой территории на территорию Советского Союза.

Вайскоўцаў было дваіх. Адзін стаяў і не цікавіўся намі, а другі вельмі добры малады чалавек быў. Ён сказаў:

— Всего не заберёшь, но муку бери.

Можна было браць колькі ўлезе. Мы незадоўга да таго часу былі намалолі мукі, закалолі вепрука, а дзень раней напеклі хлеба.

Для нас падставілі тры фурманкі з Зачарлян, але пагрузіліся на дзве — Палкосніка і Грыца, а трэцюю адправілі ў Харошчу. Суседзі не памагалі нам, але мы на іх не крыўдавалі, бо іх назначылі для вывазу нас.

Для загрузкі далі нам сорак мінут. Цешча, якой тады было 74 гады, вельмі плакала. Але ніхто з нас не супраціўляўся. Бо калі з імі добра, то і яны лепш абыходзіліся. Пасля, ужо ў ссылцы, мы даведаліся, што тых, якія супраціўляліся, забівалі, а іх дзяцей забіралі ў прытулкі.

У мужа было двух братоў — адзін у арыштце сядзеў, а другі хаваўся. І гэтаму апошняму я рашыла пакінуць мяшок мукі; салдатам сказала:

— Тут, побач нас, бедны чалавек жыве, гэта яму.

У нас быў начаваў пастух, хлопец з Беластока. Ён хацеў мець веласіпед і мы былі з ім дамовіліся, што праз лета за дагляд жывёлы заробіць ён у нас на той веласіпед. Яго таксама хацелі забраць разам з намі, але мне ўдалося растлумачыць, што гэта чужы. Яго адпусцілі, а мы далі яму свой веласіпед; ён забраў яго і падаўся ў Беласток.

Пасля нашага вывазу сястра, якая жыла ў Завадах, забрала нашы кросны. А жывёлу — двое коней, дзве каровы, дзве ялошкі і шэсць свіней — забраў саўгас у Тапільцы.

Везлі нас у Беласток праз Бацюты і Маркоўшчыну. Выязджала нас пяць душ: цешча Аляксандра, муж Эдвард, трохгадовы сын Славамір і двухгадовая дачка Рэната; ужо ў ссылцы нарадзіўся і другі сын — Ян.

У дзевяць гадзін раніцы былі мы ўжо ў Беластоку. Стаяў эшалон, а ў ім шмат людзей з Харошчы было; нам крыху адлягло. Адразу з фурманак пагрузілі нас у свінскія вагоны.

Дзеці пыталі:

— Мама, куды мы едзем? Чаму нас так вывозяць?

— Так загадалі.

— А будзем там мець домік?

Яшчэ ў той самы дзень, зараз пасля поўдня, нас павезлі. Цешча ўсё плакала, а я быццам укамянела — слёзы не ішлі. У час падарожжа поезд спыняўся на прыпынках. Мужчынам нельга было выходзіць, але жанчынам дазвалялі. Можна было ўцякаць і адзінокія аставаліся. У адной вёсцы і мне прапанавалі вопратку, намаўлялі ўцякаць. А я адказала, што толькі ваду хачу. Давалі кіпяток, які мы набіралі ў вядзерцы або збанкі.

5 мая поезд заехаў у Паўладар.

**Зінчук Аляксандр, Бацюты:**

Калі ў верасні 1939 года наступалі немцы, мы на калёніі пад Трыпуцямі былі. Тата выйшаў у поле сеяць, ад Бакін куля засвістала і коні паўцякалі.

Тата акурат перад вайною хату паставіў, у якой яшчэ не было ні падлогі, ні сценак, ні печаў. Як насталі саветы, то майго бацьку палічылі кулаком, бо ў нас было трыццаць гектараў зямлі. І мяне і яшчэ траіх у школе не прынялі ў піянерскую арганізацыю. А тата расхварэўся ад допытаў у сельсавеце і восенню 1940 года памёр. Старшынёю сельсавета быў Аляксандр Верабей з Калёніі Бацюты; ён потым пайшоў з фронтам і прапаў, а сям’я пасля выехала. Сельсавет размяшчаў-

ся ў прыватнай хаце, якой уласнікаў у Сібір вывезлі; перад сельсаветам там войска стаяла. НКУС стаяў у чыгуначнай кашарцы.

У вёску саветы перавезлі з калёніяў хату таго, што ў Сібір вывезлі і ў ёй адкрылі школу. Адна вучыцелька і вучыцель былі з Бацютаў і адзін вучыцель з Зачарлян. Вучылі па-руску, беларускай мове прысвячалася толькі адна гадзіна ў тыдзень. Для навукі хапала трох кніжак: калісь вучань чатыры гады правучыўся і ўжо мог настаўнічаць, а сёння і шаснаццаць гадоў правучыцца і заяўкі не ўмее напісаць.

У 1940 годзе арганізавалі калгас у Тапільцы, а ў 1941 — у Бацютах. Прыслалі ў той калгас двух трактарыстаў з Расіі, якіх далі нам на ўтрыманне. І яшчэ жыда на агранома назначылі і той у нас сядзеў. І мы маўчалі і кармілі іх, каб нас у Сібір не вывезлі. У Сібір вывезлі дзве сям'і — адну з вёскі, другую з калёніі. І яшчэ пятнаццаць сем'яў нарыхтавалі, але не ўспелі іх вывезці. Некаторых не прынялі ў калгас, бо забагатыя былі, і пасадзілі іх у турму. А нас у калгас узялі, бо калі тата памёр, то тады нас з кулакоў скінулі.

У аднаго гаспадара стадола была, дык у Мінцах дрэў набралі і токі і засекі парабілі пад склад збожжа. Як забіралі ў калгас сельскагаспадарчыя прылады, то значылі зубілам і пасля, як прыйшлі немцы і калгас раскідаўся, кожны сваё пазнаваў і забіраў.

**Кавальчук Ян, Чаромха:**

У войску я не служыў. Пры саветах мяне мабілізавалі ў рабочы батальён. Апранулі ў вайсковую форму, далі вінтоўку і пяць патронаў. Мы будавалі бункеры на лініі Мельнік — Драгічын-над-Бугам. (На мабілізацыю прызываўся я ў Кляшчэлях, а на камісію ставаў у Вялікіх Дзвонах за Высокім.) Кватараваліся мы ў палатках у Машчоне.

**Казбярук Мікалай, Старыя Кухмы:**

У 1940 годзе, пры саветах, пайшоў я торф капаць на Рабінаўцы. Зараблялі добра. За дзень вырабляў 10-11 тысяч штук нарэзаных рэзчыкам. Былі пры мне дзве адносчыцы з Меляшкоў: цётка Ганўся з дачкою Веркай.

З сакавіка 1941 года забралі мяне на вучэнні між Шчучынам і Ломжай. У Ядвабным нам далі мундзіры, а на другі дзень пехатою пайшлі пад Вонсаш; два кіламетры ад Вонсаша ў маёнтку стаялі. Кожную суботу ў Вонсаш у лазню хадзілі, 600 чалавек, па двах у радах. Тры дні цвічылі, а тры дні пляцоўку рабілі, вырывалі лес і мініравалі. І формы на „точкі" будавалі — стаякі і паяскі, якія пасля ў выкап ставілі. Мет-

ровыя сцены рабілі: рэйкі з вузкакалейкі, драты, каменне молатае ў шчэбень, жвір, цэмент залівалі. Колькі дабра там усадзілі!

У пачатку красавіка завезлі нас у абору і тады пяціградусны мароз выскачыў. Холадна, мерзнем, як сабакі. На „точках” польскія дзяўчаты былі і яны нас да сябе запрасілі. Мы траіх — яшчэ Юзаф Гавеньчык з Бахуроў і Ян Казбярук з Кухмоў — пайшлі да іх. Адну ноч, другую — водачка ёсць, яечкаў мазуркі нажараць — вельмі добра пражываць!

На трэці дзень камандзір роты прыехаў:

— А што вы, сволачы, адлучыліся?!

Нас у рады паставілі, мы тлумачымся, што не ведалі, бо яшчэ прысягі не было. За гэта нас заставілі зямлянкі капаць. Была норма, а мы па дзве нормы выконвалі і нам усё даравалі. Палепшала, цяплей стала, палявыя ложкі нам далі. Але пахварэлі.

**Казлоўскі Антон, Калодна:**

У вёсцы былі радыёпрыёмнікі і мы даведаліся, што ідзе Чырвоная Армія. Нашы хлопцы зрэзалі ў лесе два дрэвы — як для тэлефонных слупаў — і ад Каралёвага Моста браму паставілі з транспарантам; што там было напісана — не помню. Мужчыны сабраліся, спявалі песні — у іх ліку „Інтэрнацыянал”, — а пасля рушылі ў бок Каралёвага Моста. Калі ўжо туды даходзілі, з-за павароту пачуліся выстралы — лясною дарожкай ехалі асаднікі. Тады нашы разышліся дахаты; ніхто з іх не пацярпеў.

На другі дзень зноў падаліся ў Каралёвы Мост, але асцярожна, з разведчыкамі. З боку шашы ў Валілы пачулі магутны гул — гэта ішлі танкі БТ-7. Прыехалі яны ў Каралёвы Мост і спыніліся. Камандзір загадаў разысціся, інфармуючы, што ў наступны дзень прыедзе тылавая часць і тады саветы наведаюць усе мясцовасці. А танкі паехалі далей — браць Беласток.

У наступны дзень на двух ЗІСах прыехалі салдаты ў круглых шапках; быў гэта ансамбль. Людзі збегліся мігам. З ганка адной з хат камісар сказаў прамову, а людзі закрычалі:

— Ура! Да здравствует Красная Армия!

Пасля выступіў калектыў песні і танца, праспяваў некалькі песень, у іх ліку „Если завтра война”, „Три танкиста”, „По военным дорогам”, „Катюша”, „Распрагайце хлопцы коней”. Пасля госці папрасілі нашых, каб і мы нешта ім выканалі. І нашы ім заспявалі:

*Za podatki, protokoły*
*Sekwestrator bierze krowy.*

*Nie ma krowy — pisze ziemię,*
*A nie — wsadza do więzienia.*

Ансамбль паехаў, а на наступны дзень з'явіўся камісар, каб выбраць „председателя деревни". Сельсавет быў у Каралёвым Мосце, а раён у Заблудаве.

У кастрычніку ўсіх дзяцей паклікалі ў Каралёвы Мост. І спыталі, як мы хочам вучыцца: па-польску, руску ці беларуску. Мы ўсе адказалі, што хочам па-беларуску; і так было. Зрабілі „рэдукцыю" — усіх перавялі на адзін клас назад. Я зноў трапіў у першы клас, але ўжо вучыўся на роднай мове. І калі пры санацыі кожны дзень заняткаў пачыналі малітвай, то цяпер зраніцы спявалі „Інтэрнацыянал".

У сакавіку 1940 года аб'явілі выбары. Была прапаганда, нават у школе на калідоры плакаты павесілі. Наш выбарчы ўчастак быў у Каралёвым Мосце. Майго бацьку абралі дэпутатам сельсавета.

Жыццё ішло далей, шмат людзей стала на працу — у лес або ў міліцыю. У лесе былі назначаны нормы выпрацоўкі. Людзі рабілі і ім плацілі. Хто прыходзіў пяшком, той працаваў пры высечцы, а хто прыязджаў возам — пры вывазцы.

У 1941 годзе сталі будаваць аэрадром пад Заблудавам. І ад нас туды людзі ездзілі. Таксама ў Кур'янах станцыю перабудоўвалі. З вясны наглядаўся рух савецкіх войск. Танкі, браневікі, прычэпы ў лес цягнулі і там яны ніклі. Побач нашай вёскі было войска многа і пад Заблудавам поўныя лясы. Мы прадчувалі вайну, але ўлада нічога не згадвала, бо ж быў пакт аб ненападзенні. У маі-чэрвені настала ціш, быццам перад бурай. А ўсюды войска — аж зялёна!

**Кананчук Вера, Трасцянка:**

Саветы тут былі ў саракавым і ў сорак першым. У сорак першым мой чалавек памёр. На вывазку нейкую рыхтаваўся. Прыйшла доктарка і кажа: „Да, уж вы не пойдёте". А як ён памёр, а тата дзесьці там, каля вывазкі; то яны не бачылі і не зналі, што ён памёр. Саветы яшчэ тут сваіх парадкаў не ўводзілі — як жылі, так і асталіся на сваіх дзялках. Яшчэ нікога не вывозілі.

**Кандратовіч Сяргей, Вялікія Азяраны:**

У 1939 годзе савет да Крынак дайшоў. Брамы рабілі ў Крынках і Галынцы. Па вёсках брам не рабілі, толькі сцягі неслі і песні спявалі. Ад нас нікога не вывезлі, але вызначылі васемнаццаць сем'яў, яны ўжо спакаваныя чакалі, аднак не ўспелі да выбуху вайны. Раскулачылі і вывезлі людзей з Дублян і Кавалікаў.

У 1939 годзе забілі паліцыянта з Гальнкі — нетутэйшага, але добрага чалавека. Ягоная жонка ўцякала фурай, накрыла яго, але дагналі яе тутэйшыя хлопцы, ускрылі мужа і забілі, а яе пусцілі.

Дзядзька мой солтысам у Коматаўцах быў, то яго ягоны кум, які стаў міліцыянерам, арыштаваў. Тады дзядзькавы сваячкі наступілі на каменданта, які быў іх шваграм, і дзядзьку выпусцілі.

Калгасаў сілай не настаўлялі, толькі вялікі налог накладалі, асабліва на багатых. Трэба было здаваць збожжа, бульбу, мяса, лес.

**餮 Каролька Канстанцін, Старое Ляўкова:**

У 1939 годзе саветам браму ў Ляўкове паставілі. І кіно на шчыце хаты прадсядацеля, Сяргея Харкевіча, паказвалі. І як саветы спявалі, то аж у Капітаншчыне было чуваць — так добра было! У школе перастаў вучыць Бабяк, а на яго месца прыехалі рускія настаўніцы.

З Ляўкова саветы вывезлі толькі Урбаноўскага, паляка, які меў там краму. І мясцовага гаспадара, Зялінскага, перад самой вайной вывезлі, — палічылі яго кулаком, — але давезлі толькі да Ваўкавыска, а там ужо немцы запынілі транспарт і ён вызваліўся.

У лесе сталі рэзаць бярэзіну — саветам на самалёты; харошую бярэзіну за Касьянамі секлі. Накладалі нормы і многіх людзей з-пад Гайнаўкі прыгналі; і ў нашай хаце некалькі чалавек начавала, спалі на падлозе, на саломе. Як хто не спраўляўся з нормай, то наймаў сваякоў, каб адрабіць.

У першы год саветаў мы з братам паехалі ў Заблудаў дровы прадаваць, хутка згаварыліся з адным жыдам. Але прыбег іншы жыд, які targовае браў; яны перагаварыліся між сабою. І той што прыбег, не адпускае мяне. Я яго піхануў, ён гракнуўся аб абледзянелую зямлю, кроў з галавы ліецца. Людзі смяюцца, а мы хутка паехалі дровы скідаць. Скінулі мы дровы, а ўжо міліцыянер па мяне прыходзіць, завёў да прадсядацеля. Я дакументаў не меў, свайго прозвішча не назваў і мяне вядуць у НКУС; справа дрэнь, але мус. Зайшлі, там два маладыя хлопцы сядзяць, пакрыўджаны скардзіцца на мяне.

— Пускай гражданин расскажет, как было действительно, — кажуць яны.

— Я договорился с евреем, — гавару, — чтобы он уплатил торговое, но он не имел мелких денег. Этот держал меня за вожди, упал и сам разбил себе нос...

— Ты, гражданин, честный человек, — сказалі. — А ты, еврей — свинья! Надо было ему ещё дать!

**Касцюк Уладзімір, Козлікі:**

Саветам нейкія актывісты паставілі браму, каля школы. Былі гэта збітыя жэрдкі прыбраныя кветкамі, штосьці напісалі. Ішло савецкае войска, салдаты брудныя і неакуратныя былі. А людзі цешыліся, што свае прыйшлі.

У школе стала настаўнічаць дачка заблудаўскага бацюшкі Ніна і вучыцелька з Віцебска, якая вучыла малодшыя класы. Вучылі і па-беларуску, і па-руску. Сельсавет быў у Астраўках, там мясцовыя людзі працавалі, старшыня быў з нашай вёскі. Ён на сівым кані да ўлад у Беласток ездзіў; пасля яму таго каня ўкралі.

З Козлікаў нікога ў ссылку не вывезлі. Намаўлялі ў калгас, але не здолелі сарганізаваць. Ганялі ў лес, на загатоўку, у Ізобы. Наложаць норму, вырабіш, дык наступную норму накладалі. Або каменне для аэрадрома, што між Заблудавам і Кавалёўцамі будавалі, што другі дзень вазілі. Будаваць той аэрадром прывезлі таксама прынудзільшчыкаў з Савецкага Саюза, пасялілі іх у бараках. Калі іх пыталі, за што сюды трапілі, адказвалі:

— За что? А в колхозе воровал.

Папамучыліся пры саветах людзі і так, як спярша цешыліся, так пасля праклінаті іх.

**Кондэль Аляксандр, Нурэц:**

Рускія прыязджалі коньмі; стаялі ў Мілейчычах і Нурцы. У Мілейчычах занялі жыдоўскія дачныя дамы, у якія пры санацыі прыязджалі летаваць варшаўскія паны. А ў Нурцы сталі стаўляць казармы. Найбольш стайняў паставілі. Там, дзе саветы сталоўку мелі, там пасля палякі паставілі касцёл.

Пры саветах мог я вучыцца далей, у Брэсце, але не пайшоў. Стаў на працу ў Нурэц, памочнікам складаўшчыка быў. Кожны самаход цэглаў мусіў прыняць. Цэглы вазілі з вагонаў, з Расіі. У нас такіх цэглаў, з пілавіннем усярэдзіне, не рабілі. Пераважна, аднак, будавалі з дзерава. Спачатку лес пад будоўлю карчавалі і пасля закладалі фундаменты.

Спярша на працу я пяшком хадзіў. Пасля на будову казармаў, насіць цэглы, сталі браць дзяўчат з нашай вёскі. Прывозілі і адвозілі іх самаходам. Тады і я ездзіў з імі. А бацьку майго забралі ў Мельнік доты будаваць.

**Корх Ян, Краскаўшчына:**

Прыход саветаў восенню 1939 года называю не інакш, як асобай акупацыяй, бо бальшавікі не прынеслі з сабою ніякага прагрэсу, адно толькі галечу, грубую лаянку і пагарду да багацейшых і разумнейшых

ад іх. Я не склаў аднак рук, а стаў прасіць мясцовыя ўлады, каб выслалі мяне на курсы трактарыстаў. Да просьбы ўлады паставіліся станоўча і я паехаў на курсы ў Кобрын; вучыўся там і працаваў шэсць месяцаў. Трэба было дакладна вывучыць механізмы трох відаў савецкіх трактароў: „ХТЗ” (Харкаўскі трактарны завод), „Универсал” і гусенічны „СТЗ” (Сталінградскі трактарны завод). Першыя два трактары выглядалі дзіўна, бо колы былі без шын і паветра, мелі толькі жалезныя абручы, а на іх кальчаткі, таму іх называлі кальчакамі. Былі яшчэ цяжкія гусенічныя трактары на амерыканскай ліцэнзіі — „Сталінцы”, але толькі багатыя калгасы маглі іх мець, бо яны былі прызначаны галоўным чынам для ваенных мэтаў — цягнуць цяжкія гарматы.

Ніякага дакумента аб заканчэнні курсаў я не атрымаў; пра гэта было запісана толькі ў нейкай кнізе. У 1940 годзе накіравалі мяне ў Высока-Літоўск і там я стаў працаваць трактарыстам. Зарабляў сто рублёў у месяц, з якіх забіралі дзесяць рублёў на нейкую народную пазыку. Абед каштаваў тры рублі, а пра снеданне і вячэру трэба было самому старацца. Я вярнуўся дамоў, але і тут не было соладка, бо новыя ўлады налажылі на кожнага багацейшага селяніна непасільную норму вывазкі драўніны з лесу на цэлую зіму. Трэба было вывезці 80 кубаметраў, а хто не выканаў гэтай нормы, трапляў у турму, як, напрыклад, Васіль Старасельнік з Малых Пасечнікаў. Мяне таксама мелі судзіць, але па прычыне хваробы турмы не зведаў.

У вёсцы Махнатае быў арганізаваны калгас і савецкія ўлады накіравалі туды мяне на пасаду трактарыста, на якой працаваў я аж да выбуху вайны ў чэрвені 1941 года. Перад гэтым я выпрасіў у сваіх начальнікаў, каб дазволілі паехаць трактарам на сваю калёнію і ўзараць поле сваё і суседзяў. Аднак ніхто не захацеў гэтай паслугі; гаварылі: „Калі станем араць поле трактарам, дык пасля хлеб будзем есці відэльцам”.

Скора саветаў пагналі на ўсход, а сюды прыйшлі правіць новыя акупанты.

**Красоўская Вера, Дэніскі:**

Маю маму арыштавалі на каталіцкую вігілію, 24 снежня 1939 года. Таты ўжо не было; яго забіў сусед на шашы, калі пасля падзення польскай улады бяспраўе было. Чаму маму арыштавалі — не ведаю; хіба мы ўжо пазначаны былі. (Пазней палову нашай вёскі мелі вывезці, але на другі дзень успыхнула вайна). А 13 красавіка 1940 года забралі і нас, што ў хаце асталіся: мяне, майго 12-гадовага брата і 76-гадовага дзедка па маме. Нас саветы не забіралі, толькі дваіх тутэйшых; адзін з Плютыч быў з чырвоным паскам на рукаве, а другі таксама наш —

служальцы такія. Той незнаёмы то хаця нам гаварыў, каб забіралі, што зможам узяць з сабою. Самаходам заехалі яшчэ ў Гусакі па кабету з двума маленькімі дзяцьмі — яе мужа ўжо раней арыштавалі — і завезлі нас адразу на станцыю ў Бельск і пагрузілі ў цялячы вагон; там ужо многа народу ў эшалоне было. Заперлі нас і што хоч. У Бельск завезлі нас апоўдні, а ў поўнач поезд рушыў. Везлі нас мо два тыдні, холадна было. Спыняліся на станцыях, давалі крыху паесці і ваду — абы піць было што, але не мыцца — гэта ўжо роскаш была б! Ехалі сем'і з Боцькаў, Пілік, настаўніца Астасевіч з Дзендзялова з тройкай дзяцей-гімназістаў, жонкі паліцыянтаў.

Заехалі 28 або 29 красавіка. Завезлі нас на станцыю Кіялы каля Петрапаўлаўска ў Казахстане, а адтуль у „отделение" — сто кіламетраў на поўнач ад Кіялоў. З аддзялення завезлі нас яшчэ далей, у збожжавы калгас Селекты н-р 3; дзесяць сем'яў туды завезлі. Адкрытымі самаходамі везлі. На месцы далі абед — капусту з канінаю. Тую каніну так потам было чуць, што не можна было есці — быццам бы шкарпэтку еў. Звалілі нас усіх у барак і там як хочаш: жыві або памірай. Былі там драхлыя ложкі са старых дратоў паскручваныя. І ціснуліся хто дзе — хто на падлозе, а хто як. Мы ўсе трое на адным ложку спалі, а пасля двое, я з дзедкам. Бо брат мой прастудзіўся, а там ад прастуды на тыф, так як у нас на грып, хварэюць. І 9 мая брат мой памёр; лекар і шпіталь былі ў „отделении", восем кіламетраў ад нашага калгаса, там і памёр мой брат.

**Кузьма Аляксандр, Піражкі:**

У 1939 годзе, калі ўвайшлі саветы, я акурат кароў пасвіў, але мне расказвалі, што ў іх такія танкі, што дрэвы раз'язджаюць. Урачыстага прывітання іх у нас не было. Пасля войска з'явілася ў кожнай хаце. У нас на кухні халодны панцак стаяў, то яны той панцак з'елі. І хадзілі, песні спявалі, а нас у Сукавічы выганялі. Тутэйшыя камуністы да нашай сям'і не чапляліся, хаця мы апынуліся ў спіску для вывазу. У нашай вёсцы быў адзін багаты чалавек, дык па яго полі і агародах пасвілі. Пасля, пад немцамі, ён аднак дараваў, нікога не ўдаў; не хацеў такога рабіць.

**Кучка Андрэй, Гацькі:**

А як прыйшлі саветы, то сарганізавалі ў Гацьках калхоз, паставілі мяне брыгадзірам. За добрыя паводзіны на дзесяць дзён у Маскву на экскурсію з'ездзіў. Саветы ўзялі мяне ў армію, бо ў польскім войску я не служыў. Забралі мяне ў Прасяніцу, каля Астрові-Мазавецкай.

А як выбухла вайна, то папаў у палон у Камарова. Быў там можа з месяц і ўдалося ўцячы і прыйсці дадому. Праз усю вайну дома быў.

**Лук'янюк Мікалай, Бялкі:**

Рускія байцы тады гаварылі, што прыйшлі вызваляць Заходнюю Беларусь. Зноў адчынілі школу. У хаце Мікалая Міхальчука (ён жыў тады толькі з сястрою) утварылі „красный уголок" і пачалі рыхтаваць дрэва на лазню. У вёсцы Агароднікі ў маёнтку ўтварылі сельсавет і рабілі штодзень вясковыя сходы, падмаўляючы людзей запісвацца ў калгас. Але нашы людзі не паддаваліся. Налажылі тады на кожнага селяніна „предналог", колькі кубаметраў мае завезці камення ў Заблудаў — там пачалі будаваць аэрадром. Помню, было гэта вясной 1940 года, калі на свята Сёмухі прыехаў чыноўнік ды пачаў выганяць, каб ехалі на вывазку камення. Мужчыны сабраліся і сказалі яму, што ў нас Тройца, і працаваць ніхто не пойдзе. А ён раскрычаўся: „Какая тебе тройка, туда твою мать, я тебя сейчас на белые медведи отправлю, там ты увидишь свою тройку!" Папалохаліся людзі ды паехалі збіраць па палях каменне — не было тады ні нядзелі, ні свята.

Пачалі ў той час прызываць маладых хлопцаў у армію. З нашай ваколіцы трапілі туды мае два дваюрадныя браты, якіх накіравалі ў Карэла-Фінскую ССР у горад Кем; адзін, Іван Грыгарук з Трасцянкі, вярнуўся з вайны дадому, а Іван Германюк прапаў. Мой швагер Аляксандр Грыгарук з Трасцянкі быў старэйшага ўзросту, яго забралі ў рабочы батальён у Асавец будаваць узмацненні; ён таксама трапіў у нямецкі палон, потым у савецкія шахты на Данбас, і вярнуўся ў 1946 годзе дамоў...

А мне прыйшлося хадзіць у школу пры саветах.

**Ляўчук Вольга, Палічна:**

Бацька наш пры старой Польшчы быў лоўчым. У саракавым годзе саветы яго арыштавалі. Памятаю, як сказаў маці на развітанне: „Мяне забіраюць і вас неўзабаве вывезуць. Чакайце весткі. Калі стане вядомым, дзе знаходжуся, дык да мяне прыязджайце. Жыць разам будзем".

Прадбачанне збылося. Месяц пазней прыйшлі за намі. На ўсё жыццё запамяталася мне гэта ноч. Пятнаццацігадовым дзяўчом я была. Гэта было 13 красавіка 1940 года. Злашчасная трынаццатка, нешчаслівы дзень...

Разбудзіў нас грукат. У дом уварваліся энкавэдзісты. Былі ўзброеныя ў аўтаматы. Зруйнавалі памяшканне, затым загадалі: „Собирайтесь. С нами поедете!.."

— Ды, як я без мужа з дзеткамі паеду? — загаласіла матуля. Але, шэльма, вайсковец, быццам не яго тычылася, камандаваў: „Без разговоров! Побыстрее шевелися!”

Завязала маці ў клункі вопратку і прадукты для дарогі, зняла са сцяны ікону Божай Маці і, пацалаваўшы яе, засунула за пазуху. Выходзячы прыхапіла мяшочак з сухарамі.

На панадворку каля хаты нас чакала фурманка. Навокал цішыня, ніякага шуму, ніякага голасу не чуваць. Нават сабакі не брахалі прадчуваючы нешта ліхое.

Пагрузіліся на воз упецярых: маці са старэйшым братам Федзькам ды малодшым Янкам, і я з сямігадовай Лідкай.

Завезлі нас у Кляшчэлі і пагрузілі ў таварныя вагоны. Шэсцьдзесят дзве асобы — адны жанчыны і дзеці. Прыселіся на нарах. Разам з намі аказалася Анна Крупіч з Дабрывады. Да грудзей туліла хлопчыка, Васем яго называла. Памятаю, што ў падарожжы я яго калыхала. Кляшчэлі пакідалі мы ў дажджлівае надвор’е. Здавалася, што нябёсы літуюцца над нашай доляй і выліваюць з вышыні слёзы.

Праз краты ў акенцы прабіваліся мізэрныя бляскі святла. У вагоне смярдзела потам і нясвежым паветрам. Побач дзвярэй сядзеў вартаўнік з аўтаматам. Ехалі амаль не спыняючыся. Толькі час ад часу чарговыя вагоны з перасяленцамі прычаплялі.

Пад’язджалі да Ваўкавыска. Яшчэ цягнік не спыніўся ў перонах, як побач апынуўся натоўп людзей са святаром на чале. Нехта загаласіў у вагоне. Такі ж віск пачуўся ў натоўпе, быццам са скуры кагосьці абдзіралі. Спазматычным плачам заносілася ўся станцыя. Затым рыданне перамянілася ў магутны гул. Калі цягнік ад’язджаў я ўбачыла праз шчылінку, як святар ставіў знак крыжа за аддаляючымся поездам.

Падарожжа працягвалася. Поезд спыняўся толькі на большых станцыях, каб абяспечыць нас кіпятком. Прыносілі па два вядры да вагона і выдавалі па кубачку кіпятку, якім мы разагравалі страўнікі. Туалета ў вагоне не было, за сваёй патрэбай хадзілі ў вугал вагона, дзе за занавескай спускалася ўніз жалезная труба. Ад смуроду балела галава.

Не ведаю, як доўга ехалі, бо страціўся рахунак дзён. Чым даўжэй ехалі, тым больш холадам цягнула. Праз акенца бачыла я то магутны лес, які шырокім пасам цягнуўся па абодвух баках пуці, то стэп, бязмежную раўніну.

Цягнік затрымаўся. Вартаўнікі адчынілі дзверы. „Выгружайтесь”, — загадалі. Калі выходзілі з вагона, дык нічога не бачылі апрача велізарных гурбаў снегу. Прывыклыя да цемры вочы, прыплюшчваліся ад светлазалацістай белі. „Тут паміраць будзем”, — сказала маці і кінула

позіркам у адкрытую прастору. І раптам угледзела постаць: адну, другую... „Гэта ж людзі”, — узрадавалася маці. Мы накіраваліся ў іхнім напрамку. Падышлі бліжэй і ўгледзелі шмат зямлянак, пакрытых снежным пухам. Мы апынуліся ў паўночным Казахстане ў Кіеленскім зернасаўгасе (раён Смірнава, Петрапаўлаўскай вобласці). Затым выявілася, што мы выгружаліся непадалёк станцыі Кіялы, чацвёртага чыгуначнага аддзялення.

**Мазалеўскі Андрэй, Хільмоны:**

Саветам брамаў не будавалі, хаця рады былі ім. У нас яшчэ іх не было, то ў Дуброву ездзілі паглядзець; там яны ўжо ўладу ўстанаўлялі. Пры саветах можна было жыць, хаця спачатку кантынгенты былі. На Сібір з нашай вёскі нікога не вывезлі.

У 1940 годзе захварэў я раматусам, не мог хадзіць. Паехаў са скіраваннем у шпіталь у Гродна; пры Польшчы быў там жыдоўскі шпіталь, а пры саветах 2-я Гарбальніца. Месц няма. Сваячка была дакторкай і я да яе. Яна недзе пайшла і неўзабаве раскладушку мне на калідор прынеслі. Адзін дагараў і мяне пасля на яго месца перанеслі. Ляжаў я два месяцы і памалу пачынаў хадзіць. Аднойчы спыніўся я ў нішы, у якой партрэты Маркса, Энгельса, Леніна і Сталіна віселі. Прысеў да мяне адзін жыдок з Аўгустава. Раней меў ён два дамы і краму жалезную, якую саветы знацыяналізавалі. Ішоў ён аднойчы вуліцаю з сынком, а той яго пытае: „А ці калісь гэта зноў будзе наша?”

На другі дзень той жыдок кажа мне:

— Ідзем у канцылярыю на радыё, Бі-бі-сі паслухаць.

Я тады адмовіўся, але пасля нейкага часу згадзіўся. Пайшлі ў канцылярыю, а там два маладыя жыдкі сядзелі. Мой праваднік сказаў:

— Wi№cz BBC!

Тыя пераглянуліся, а ён:

— Wi№czaj na moj№ odpowiedzialnoњж!

Схадзіў я туды тры разы і пабачыў, што тыя пабойваюцца. І я адмовіўся — час такі быў, што і пра мяне маглі што падумаць.

Калі вярнуўся дахаты, атрымаў у Дуброве скіраванне ў санаторыю ў Друскенікі. Узяў я „справку” і паехаў у Гродна. Абышоў там усе „здравы” і нічога не дабіўся. Падаўся на станцыю назад дахаты ехаць; там былі тры бабы з нашай вёскі. Калі меў прыехаць поезд, дзверы зачынілі і праз брамку ўпускалі. Даходзім да брамкі і нам брамку зачыняюць. А той, што перада мною быў, загергітаў па-жыдоўску. І за мною таксама жыдок. Іх прапусцілі і я між імі ўвайшоў; тыя бабы асталіся і пяшком вярталіся.

**Масальскі Канстанцін, Фальваркі-Тыльвіцкія:**

1939-1941 гады і пазнейшыя запамятаў я даволі добра. Восенню 1939 года пайшоў я ў беларускую школу ў Тапаляны. Пасля паўгоддзя перавялі мяне ў другі клас, хіба таму, што добра вучыўся. З маладых гадоў выхоўвалі мяне бабуля Зофія, дзед Міхал і цётка Марыся — сястра мамы Олі Скарупскай. У Фальварках быў я госцем і ў час канікул. Будучы дома збіраў я з поля каменне, якое бацька вывозіў на будову шашы з Заблудава ў Міхалова. Даволі часта даводзілася хадзіць у Заблудаў з мамай, якая прадавала масла, сыр і яйкі рабочым, што будавалі ваенны аэрадром між Заблудавам і Кавалёўцамі.

Не забуду, як бацька купіў у кааператыве на заблудаўскім рынку газавую лямпу, якую можна было павесіць на траме, на сцяне, ставіць на стале. Было намнога відней чым пры газоўцы. Вельмі я радаваўся, калі бацька прывёз тканіны на сукенку маме, на бялізну і мне на адзенне. Я ганарыўся, што калі мама пашые мне вопратку, змагу ў нядзелю пайсці ў царкву. Таксама захапляўся я, калі бацька прывозіў з базару ў Заблудаве белыя булачкі і цукеркі. Бацька і маці, едучы жалезняком на рынак у адлеглы за трыццаць кіламетраў Беласток, былі вымушаны ўставаць гадзіну-дзве пасля поўначы. Вяртанне было цяжкае; пасля прыезду бацька заўсёды наракаў на вялікія чэргі ў крамах і на налогі.

Пры савецкай уладзе ў Тапаляны прыязджала кінаперасоўка, якая паказвала савецкія кінафільмы ў адной са школьных зал. Дзяцей прапускалі бясплатна, а дарослыя плацілі, але хіба нямнога, бо заўсёды была процьма гледачоў. Дзеці сядзелі на падлозе, а дарослыя ў партах. Карціны паказвалі вайну або савецкае будаўніцтва. Здаецца, што паказвалі карціну „Вясёлыя рабяты” з Любай Арловай. У той час бацька памяняў саламяную страху на цэментную чарапіцу і перарабіў печы на кафляныя.

Асабліва запамятаў я прызыў майго бацькі ў савецкую армію на вучэнні ў маі 1941 года. З мамай адвезлі мы бацьку на зборны пункт, які размяшчаўся на левым беразе Рудні ў Заблудаве па вуліцы на шляху Заблудаў — Гайнаўка. Мы чакалі, аж прызыўнікоў сфарміравалі ў калоны, якія рушылі ў напрамку Беластока. Я правёў бацьку аж за заблудаўскі рынак, на якім ужо стаяў помнік Леніну. Там я падбег да бацькі і пацалаваў яго; так я развітаўся з бацькам. Маці сама асталася гаспадарыць на васьмігектарнай гаспадарцы.

Бацька стаяў у маёнтку каля Шчучына ў Граеўскім раёне. Кватараваўся ў бараку. Асноўнымі харчамі былі каша, бульба, соленая сушаная рыба і хлеб. Найбольшы клопат быў з некаторымі запаснымі яў-

рэйскай нацыянальнасці, якія асабліва на кросе стараліся не дабягаць да канца, а ў час стральбы стралялі міма мішэні.

**Міхальчук Конан, Трашчоткі:**

У 1941 годзе саветы прызвалі мяне ў армію, змабілізавалі многа людзей. Трапіў я ў Асобны сапёрны батальён. Было нас каля 500 чалавек. Завезлі нас у мясцовасць Кросеніца каля горада Замбрава. Там жылі мы ў палатках, расстаўленых на вялікім полі. Нашым заданнем было збудаваць абарончыя бункеры для рускіх і ўзмоцніць граніцу. Будавалі „точкі" — капалі глыбокія ямы, залівалі іх бетонам і такім спосабам рабілі паасобныя паверхі і ўстанаўлівалі гарматы. Там быў я тры месяцы. Цяжка было, можна сказаць — катаржная работа. Не было ніякіх умоў для нармальнага жыцця. Як злачынцаў нас трактавалі.

Пасля трох месяцаў успыхнула вайна. Дакладнай даты не памятаю, ад слабасці часам і памяць губляў. Немцы разбілі нас цяжкай артылерыяй. Наша начальства хацела ўцячы. Селі ў самаход, а немцы кінулі бомбу і ўсе загінулі. Асталіся мы без ніякай апекі і папалі ў палон. Было нас амаль 2 900 чалавек. Было гэта каля Мінска-Мазавецкага. Загналі нас у яму ў старой цагельні, расставілі па двух баках кулямёты, а нам загадалі адвярнуцца тварамі да сцяны. Хацелі нас расстраляць, бо сярод нас былі пераапранутыя палітрукі. Палітычных афіцэраў было каля пяцідзесяці. Перад расстрэлам людзі пачалі скакаць, крычаць і ў той момант над'ехаў нямецкі самаход з ваенным камандаваннем. Людзі супакоіліся. Генерал сказаў, што калі выдамо палітрукоў, астанемся ў жывых. Было гэта немагчыма, бо мы адзін аднаго не ведалі. Тады адмяніў ён загад аб расстрэле. Прастаялі мы ў той яме тры гадзіны і калі пачало змяркацца, загадалі нам легчы на зямлю тварам уніз. Так мы ляжалі ўсю ноч.

Ранкам прыехалі вялікія самаходы. Пагрузілі нас у іх і завезлі ў лагер Остраў-Камарова. Не было там ніякіх будынкаў, толькі ямы, у якіх нас пасялілі. Былі мы там каля месяца. Урэшце сфарміравалі нас у групы, пагрузілі ў поезд і павезлі ў Германію.

**Насковіч Рыгор, Кляшчэлі:**

Рускія ўвайшлі ў Кляшчэлі ў 1939 г. без перашкоды, размясціліся па кватэрах. Штодзень ездзілі ў Кузаву будаваць ваенны гарадок. Карысталіся адзіным аўтамабілем, які прыводзіўся ў рух паравым рухавіком. Як дроў не стала, дык і аўтамабіль „глух" на месцы. У гарадку штодзень на паветры кінасеансы ладзілі. Найчасцей дэманстравалі фільмы аб каханні і ваенныя. Прымушалі ездзіць у Белавежскую пушчу на „загатоўку леса". Норма на аднаго — сорак кубаметраў. Ссякалі дрэвы ўручную. Пазней пасылалі бу-

даваць доты на Бугу. Вербавалі на пабудову Беламорканала, але, калі ахвотных не стала, дык паводле спіска назначалі, а падазроных проста ссылалі. Тыя, што сышчыкамі рускіх сталі, усялякую брахню выдумоўвалі. Памятаю, як такі прыйшоў да бацькі і кажа: „Як вепручка дасі, дык на ссылку не паедзеш, а як адмовішся, сам ведаеш, што цябе чакае...”

Пры саветах школа працавала ў даўнейшым будынку. Рыбакова была дырэктарам, вучылі — Анна Манаэхаўна, Валянціна Іосіфаўна, Вольга Калішэвіч (родам з Кляшчэляў), Данат Максімчук і Эдуард Зямлянскі. Апошні навучаў нямецкай мове. Заняткі вяліся на рускай мове. Беларускай мове вучыў Сяргей Сегень, а стары Евец вучыў спеваў. Нервовы быў і аднаму вучню смык на галаве паламаў. На ўроках многа гаварылі аб палітыцы і перамозе бальшавікоў.

Шлюбы ў загсе рэгістравалі, бо царкоўныя лічыліся незаконнымі. Святарам забаранялі з хрэсным ходам хадзіць. Запамяталася мне здарэнне з 1939 года. Пасвіў я кароў на пашы. Непадалёк апусціўся самалёт-біплан, з якога выйшлі трое мужчын. Прыехалі паліцэйскія. Незнаёмцы спыталіся, дзе яны знаходзяцца, а затым папрасілі бацьку, які непадалёк на полі быў, завезці іх пад адлеглую за тры кіламетры цагельню. Пятнаццаць злотых за гэта далі. Лётчык на польскай мове гаварыў. У мястэчку гаварылі, што гэта нямецкія шпіёны былі.

**Нікалаюк Кузьма, Піліпкі:**

У саракавым годзе прыйшоў рускі вярбоўшчык намаўляць нас у шахты ехаць. Я, як не было мацеры, жыў пры мачасе, мне тады было васемнаццаць гадоў, малады быў і запісаўся. І Вася, жанаты сусед, што цераз хату жыў, запісаўся туды. І Ванька, якога дзяўчына палюбіла і прыйшла да яго жыць, але яшчэ не венчаныя яны былі, таксама запісаўся. Мы пыталі яго, колькі ў шахтах можна зарабіць у месяц, а ён адказаў, што боты такія як на ім. А боты ў яго прыгожыя былі, відаць далі яму такія, каб людзі дзівавaліся. Мы падпісалі дэкларацыі на год.

Прыехалі аднойчы да нас паглядзець, ці бацька кантынгент збожжа здаў. Бацька ў той час у царкве быў і я тыя квіты знайшоў і паказаў кантралёру. Ён паглядзеў і сказаў:

— Вот это правильно! Сейчас можете и водку пить, и молиться: зерно завезено.

Майго бацьку, і яшчэ аднаго, мелі ў ссылку вывезці. Судзілі ў суботу і загадалі, каб да панядзелка вывязаўся з вывазкі камення. Бацька прыехаў з суда, упаў на калені і стаў маліцца. Маліўся ад абеду да вечара, а рана сталі бомбы кідаць, як немец на рускіх пайшоў. Выпрасіў бацька ў Бога.

У нас настаўнік астаўся, які пры Польшчы вучыў. Добры быў гэта чалавек, Качэва, здаецца, называўся. І як Польшчу ў трыццаць дзевятым разбілі, то ён прыйшоў у Пасынкі да аднаго такога Мікіты, які быў арганізатарам савецкай улады ў Пасынках, і спытаў, ці можа там астацца. А той Мікіта яму адказаў:

— Ідзі туды, адкуль ты прыйшоў!

**Нядзельская Зінаідая, Орля:**

Калі ў верасні 1939 г. адступілі немцы і прыйшлі саветы, тады Вайштына вывезлі ў Расію, а кафлярняй стаў загадваць савецкі чыноўнік Лейкін. Ён забраў да сябе таксама пажарны духавы аркестр. У цэнтры Орлі, за царквою яўрэй Ошар адкрыў спецыяльна для старэйшых рангам савецкіх салдат сталовую з алкаголем. Арлянскія яўрэі пераважна займаліся гандлем і баяліся, каб саветы не забралі ім крамаў, або не абакралі. Савецкія салдаты куплялі танныя квяцістыя тканіны для дому. Неўзабаве паліцы зусім апусцелі, не было нават цукру і мыла. Гэтае апошняе можна было дастаць у салдат за паўлітра гарэлкі. Урэшце людзі самі сталі варыць мыла са старога мяса, сала, падла і каўстычнай соды.

З рук савецкіх салдат загінулі ў нас бязвінныя людзі і памяць аб гэтых трагічных падзеях жыве сярод арлянскага грамадства. Пры санацыі моладзь праходзіла ваеннае абучэнне, давалі ім процігазавыя маскі. Савецкія салдаты, а былі гэта касавокія байцы, напіліся аднойчы гарэлкі і сталі шнырыць па Орлі. На адным панадворку сустрэлі 19-гадовага Ваню Вярбіцкага з процігазам. Юнака палічылі яны шпіёнам і павялі з сабою ў крывятыцкі лес. Ратаваць сына пабеглі маці Софія і бацька Антон, але ніхто адтуль жывым не вярнуўся. Круглай сіратой засталася 8-гадовая Вера, якая ў той час была ў цёткі. Пазней, калі рускія адступілі, людзі знайшлі трупы. Бязвінныя ахвяры, якія загінулі 24 чэрвеня 1941 г. добрыя людзі пахавалі ў адной магіле на могілках у Орлі. У той самы дзень загінула яшчэ трое жыхароў мястэчка. Каваль Міхал Война і школьны стораж Аляксандр Якімовіч хацелі схавацца ад саветаў у падвале школы, але паколькі былі яны чыста апрануты, палічылі іх шпіёнамі, буржуямі і расстралялі на месцы, ля сённяшняй вуліцы Аградовай. Якуб Назарэвіч загінуў на сваім панадворку, праўдападобна ад шалёнай кулі.

**Панасюк Ніна, Старое Беразова:**

Пачалі мы жыць пад саветамі. Забралі яны мужа маёй сястры Насці ў Картуз-Бярозу; гаварылі, што „на временный сбор”. Будавалі там ваенны аэрадром. Сястра Насця асталася з малым хлапчуком на руках. Гэта быў першы дотык вайны, але не апошні.

**Патэюк Антон, Карыціскі:**

За дровамі даводзілася ездзіць у пушчу, туды ж хадзілі ў грыбы і ягады. Але на гэта трэба было мець дазвол, купляць білет за 2-3 злотых. Потым усіх леснікоў саветы вывезлі. Рыбы ў нашай рэчцы было мала. Рамеснікаў у нашай вёсцы не было, усе жылі з зямлі. Скаціну пасвілі ўсе разам, пашы ў нас было ў вёсцы каля 50 гектараў. Тое, што вырасціць удавалася на зямлі, не было дзе прадаць. Вельмі часта адзінымі, хто купляў, былі жыды, таму і адносіны да іх былі добрымі. Калі прыйшлі немцы, я сам насіў тавар на продаж да іх, зарабіў некалькі марак. У 1939 г. немцы, якія прыйшлі, былі проста анёламі ў параўнанні з тым, як яны сябе паказалі ў 1941 г. Калі спачатку яны адпускалі польскіх салдат, дык у 1941 г. толькі палілі ды расстрэльвалі. Камуністам у Карыціску быў Карп Германовіч, які затым пайшоў працаваць у брэсцкую міліцыю. У верасні 1939 г. зрабілі ў Карыціску браму, каб сустрэць Чырвоную Армію, але тая да вёскі не дайшла. Яна ўвайшла толькі ў Дубічы. Салдаты прыехалі потым, калі ніхто іх не чакаў. Браму разабралі і выкінулі за вёскай. Саветы сілай пачалі заганяць людзей у калгасы, але ў нас іх не было — бліжэйшы быў у Корніне. Перад самай вайной у нас забралі да войска Андрэя Германовіча. Служыць ён папаў у Брэсцкую крэпасць. Немцы ўзялі яго ў палон і ў лагеры ў Белай-Падляшскай ён памёр.

**Перавой Юлія, Наройкі:**

Саветы вышку ў вёсцы паставілі. Адну сям'ю з Наройкаў у Сібір вывезлі і ніхто з іх не вярнуўся. У Сківах адзін цэглу выпальваў, палічылі яго кулаком і вывезлі. Пасля забралі жонку з дзецьмі. Яна з траімі дзецьмі вярнулася, а ён прапаў.

**Петручук Мікалай, Трасцянка:**

Калі насталі саветы, яны сарганізавалі ў Трасцянцы васьмігодку, у якую хадзілі дзеці з навакольных вёсак. Было іх многа і трэба было арганізаваць напр. тры пятыя класы. Працавалі тут настаўнікі Барбара Баралік з Беларусі (яна навучала беларускай мове), Глушчанка з Расіі і траіх, яшчэ „царскіх", настаўнікаў з Трасцянкі; пры санацыі яны не маглі навучаць. Пры саветах я закончыў пяты і шосты класы. Калі насталі немцы, яны не арганізавалі ніякай школы.

**Плева Сцяпан, Істок:**

На прывітанне Чырвонай Арміі паставілі ў вёсцы дзве брамы, па адной з кожнага канца. У адным канцы нашы шукалі які чырвоны кава-

лак тканіны або чырвоную фарбу, каб што памаляваць. А ў нашым канцы Якім Барысаў выразаў з дошкі серп і молат ды звязаў іх; саветы пахвалілі гэта: „Тут хороша брама”.

Як прыйшло рускае войска, то людзі гаварылі, што яно брыдкае, бо ў брыдкай вопратцы. Калі ўстанавілі граніцу на Бугу, то зрабілі гміны ў Арэшкаве і Старым Корніне. Там было па двух чалавек, адзін пісаў. Сталі тады вывозіць гаёвых і ляснічых і зямлю ў людзей адбіраць. Забіралі бацюшкаў і ксяндзоў; усіх іх камуністы выдалі — яны верылі ў камуну і з рэлігіі насміхаліся.

Можна было зарабіць шмат грошай, але што з іх. Як я працаваў на чыгунцы, то месячнага акладу было 250 рублёў, але калі што выходзіла не так, дык зарплату аднімалі. І цяжка было што-небудзь купіць; мне ўдалося купіць адно світэр.

У Махнатым зрабілі калхоз. У Старым Корніне быў багаты чалавек, меў участак поля. Яго сын адукаваны быў, у пеўчых хадзіў. Калі прыйшлі саветы, ён уцяміў, што ім будзе капец. І ён захацеў зрабіць калхоз. Калі хто туды запісаўся, адводзілі нейкі абшар поля і засейвалі аўсом; усё поле аўсом засеялі. Я з бацькам ехаў з Орлі і бачыў, што рускі трактар стаяў з плугамі. Для калгаса нічога не будавалі, толькі забралі для яго патрэб карнянскую царкоўную клуню, якую вярнулі пасля прыходу немцаў.

У нашай вёсцы саветы нікога не арыштавалі, але ў Дубічах арыштавалі памочніка бацюшкі і ён так прапаў. Яшчэ пакуль насталі саветы, то ў Дубічах былі такія камуністы, што арыштавалі бацюшку і вучыцеля і завезлі іх у Бельск, на паліцыю. А камендант іх паўстыдаў, што духоўнага арыштавалі. Гаварылі, што ноччу прыехаў нямецкі самаход і ён выехаў.

Зрабілі і ў нашай вёсцы сход, каб калгас рабіць. Там сядзеў якісь з Чаромхі. Мы з сябрамі крыху спазніліся, бо з працы на чыгунцы вярталіся. Ён да мяне, каб у калхоз пісацца, а я яшчэ хітраваць не ўмеў і пасумняваўся, навошта той калхоз. А быў там адзін кавалер з Чахоў, яму мо з васемнаццаць гадоў было. Ён працаваў на чыгунцы, добра зарабляў, гадзіннік шыкарны сабе купіў. І ён сказаў:

— А ў нас арганізавалі калгас і назвалі яго „Дзяржы, бо разбягуцца”.

То яго той з Чаромхі порхнуў у нос.

У Кляшчэлях, як і пры санацыі, былі базары, куды людзі прывозілі мяса, крупы і інш. Казалі, што аднойчы нехта вароне адрэзаў крыло і напісаў картачку „Я прыйшла з калгаса”. Тая варона з гэтай меткай па базары ходзіць, бо без крыла не паляціць; і актывісты гэта глядзелі.

**Пуц Сцяпан, Барысаўка:**

Нас, маладых, паслалі ў школу вучыцца рускай і беларускай мовам. Вучыліся каля 60 чалавек, настаўнік называўся Бруква. Старэйшыя мужчыны вымушаны былі працаваць, нормы выконваць. Спярша трэба было каменне ў Гайнаўку вазіць; мой бацька меў 2 вазы і 2 кані, то ўсе камяні з поля вызбіралі, я таксама памагаў бацьку збіраць і вазіць. Пасля выганялі на вывазку лесу: пад Каралюкамі бярозу рэзалі, аднак майго бацьку не выганялі, бо старэйшы быў.

Восенню 1940 года малацілі мы з братам збожжа. Прыехаў да нас „наставник" з раённага НКУС і да бацькі:

— Почему зерна нормы не отдаёшь?

— Товарищ, — кажа бацька, — дай мне на другі год пасеяць, то я здам.

— Даю 24 часа термина, а после разделаемся с тобою.

І бацька цэлую ноч шопелькаю веяў і на другі дзень здаў. Была пара сеяць, то мы зноў намалацілі. А бедныя гаварылі:

— Рускія прыйдуць — нам хлеб дадуць.

Саветы зрабілі спіскі тых гаспадароў, у якіх было больш 10 гектараў, на вываз у ссылку. Апынуўся на ім мой бацька і Барко з Ласінкі. Аднак летам 1941 года ўспыхнула вайна.

**Рамановіч Уладзімір, Астраўкі:**

Польска-нямецкая вайна 1939 года застала мяне ў Астраўках. Неўзабаве прыйшлі бальшавікі і зрабілі з немцамі чацвёрты падзел Польшчы. У гэты час дзядзька Гаўрыла заплаціў мне грошы, якія былі прызначаны на „чорную гадзіну", але ў нас ужо залатоўкі не хадзілі і я быў вымушаны паехаць у Варшаву і там нешта купіць, а гэта ўжо тады была заграніца. Ад'язджаючы меў я 16 рублёў, а білет на поезд з Беластока ў Чыжэва каштаваў 3,6 рубля. Далей трэба было ісці пяшком і там шукаць праваднiка, каб правёў праз граніцу. Праўда, купіў я тады сёе-тое ў Варшаве. Такіх як я там было многа. Калі вярталіся мы з Варшавы, у Малкіні праверылі нас немцы і перапpавілі цераз граніцу. Холадна, снег і вецер, а я і яшчэ адна дзяўчына з Беластока ідзем па рэйках у сваім напрамку. Пасля некалькіх гадзін зайшлі мы да дарожнага стоража папрасіць пераначаваць. У мяне ў кішэні застаўся толькі 1 рубель, за які можна было купіць білет да Шэпятова, а там ужо паехаў бы без білета, абы неяк дабрацца ў Беласток, а адтуль ужо ў родныя Астраўкі можна пайсці пяшком. Зваротная дарога аказалася вельмі доўгай і вярнуўся я толькі ў лістападзе 1945 года.

У мясцовасці Лапы мяне арыштавалі і пасадзілі ў беластоцкую турму 20 студзеня 1940 года. Потым мяне перавезлі ў Брэст і там адчыталі „приговор” — тры гады турэмнага зняволення. У лютым 1941 года перавезлі мяне ў лагер Ерцава Архангельскай вобласці. Пасля польска-савецкага дагавора мяне як польскага грамадзяніна адпусцілі з лагера. 20 кастрычніка 1941 года далі мне 60 рублёў і білет да станцыі Яр і пасведчанне: „На основании указа Президиум Верховного Совета Романович Владимир Кузьмич амнистируется как польский гражданин и имеет право проживать по всей территории СССР за исключением городов первой и второй категории в военное время”. Пасведчанне мела трохмесячную сапраўднасць. Гэта абазначала, што мяне цяпер чакае рознае. Дастаць білет на цягнік было вельмі цяжка і для гэтага трэба было мець адпаведныя дакументы, а таксама справку з лазні, што няма вошай. Прыходзілася па-рознаму, часамі 4 сутак нічога не еў, а вошай карміць мусіў, бо яны па мне як мурашкі ў мурашніку бегалі. Так і бадзяўся я ад калгаса да калгаса, каб зачапіцца за работу хаця б за адны харчы. У адным калгасе спаткаў мяне міліцыянер і стаў правяраць дакументы. Аказалася, што мне ізноў пагражае 10 гадоў турмы за тое, што не яўляюся ў ваенкамат. Там яшчэ злавілі аднаго жыхара Лапаў і павезлі нас у ваенкамат у Цішлах. Мяне прызначылі ў 1550 Рабочы батальён у горадзе Уфе. Па стане здароўя мяне адпусцілі ў сакавіку 1942 года. „Ну, — думаю, — цяпер вясна, лягчэй знайсці працу”. І такім чынам у калгасе пасвіў я кароў, авечак і коз. Хутка паправілася маё здароўе. Калі другі раз мяне выклікалі ў ваенкамат, дык прызвалі ў баявыя часці. Тады пачалася мая баявая вандроўка з Чырвонай Арміяй. Прайшоў я ад Кіева да Дрэздэна з Першым украінскім фронтам. Дэмабілізавалі мяне ў лістападзе 1945 года і толькі тады я вярнуўся ў свае родныя Астраўкі. Вярнуўся як батрак на пустыню пасля 5-гадовага блукання па лагерах, а потым па сцежках ваенных дарог.

**Русь Міхал, Тапілец:**

Калі насталі саветы, дзядзька Шыман недзе з савецкім войскам зацерушыўся і дзядзька Ежы (які пасля стаў старшынёй калгаса ў Тапільцы) сказаў, што гэта наш тата яго забіў. Бацьку яшчэ ў 1939 годзе саветы вывезлі, сказалі што за тое, што панам дарогі будаваў. Асталіся мы з мамай. Старшы брат стаў на працу на чыгунцы ў Граеве.

13 красавіка 1940 года апоўначы забарабанілі ў акно:

— Вставайте, собирайтесь! Поедете к отцу, он ожидает вас. Берите книжки, тетради, в школу пойдёте.

Забралі нас пецярых з мамай і яшчэ адну сям'ю ў газік і завезлі ў Старасельцы, у таварны вагон з прычамі; ужо там дзве сям'і было. Прыхапілі з намі і бабулю, але той Ежы прыехаў у Старасельцы і забраў яе. Брат у той час прыехаў з Граева і суседка сказала яму, што нас у Старасельцы павезлі. І ён падаўся за намі, бо мы ягоны гармонік на педалі забралі з сабою. На рампе ніхто да яго не чапляўся, ён забраў гармонік і паехаў; калі б быў з намі дома, то і яго забралі б.

Пазней над братам зноў павісла небяспека. Калі немцы напалі на СССР, каля Тапільца над Нарваю самалёты біліся і брат сказаў, што рускія паб'юць немцаў. А толькі нашы людзі былі слухалі. І на трэці дзень брата за гэта на ўчастак забралі. Перакладчык, які там быў, ведаў нашага бацьку, бо ў ягонай вёсцы дарогу будаваў і сказаў, што брат гаварыў інакш. І брата адпусцілі, а то немцы застрэлілі б яго.

Стаялі мы ў Старасельцах бадай два дні, пакуль трыццаць вагонаў запоўнілі сем'ямі леснікоў і гаёвых. Мо 17 або 18 красавіка выехалі і 1 мая прыехалі ў Паўладар.

**Саевіч Валянціна, Старое Ляўкова:**

Да вайны хадзіла я ў школу ў Нараўцы, бо ў Ляўкове былі толькі чатыры класы; пахадзіла адзін год і пачалася вайна. Прыйшлі саветы і гаварылі нам: „Мы вас освободили"; вызвалілі нас ад хлеба, ад солі... Некаторыя то чакалі саветаў, гаварылі: дадуць свабоду, бо ж пры санацыі то свабоды не было. Я ўжо ўсяго дакладна не помню і вельмі шкадую, што пра тое не захавалася ў мяне савецкая кніжачка, вершам пісаная, якую я атрымала за добрую навуку; бо як прыйшлі немцы то загадалі ўсе кніжкі і часопісы занесці да солтыса. Я па-руску крыху ўмела, бо ў Нараўцы жыла ў Барвы Панкоўскае, якая спявала ў царкве і выпісвала рускую газету, і я з тае газеты па літарцы навучылася; жыла ў яе ад панядзелка да суботы, а на нядзелю дадому прыходзіла. Саветы ў ляўкоўскай школе вярнулі нас на два класы: калі я ў Нараўку хадзіла ў пяты клас, то ў Ляўкове загадалі мне хадзіць у трэці. Першы год я не хадзіла, бо не было ў што адзецца і што на ногі налажыць, а пасля абувала пасталы або боты па старэйшым браце. А маразы былі па сорак і больш градусаў, і вятруга; адзін раз, калі б мяне мачаха не пусціла дахаты, то і замерзла б я пад дзвярыма, бо ўжо сама не дала рады адчыніць.

Перад саветамі ў Ляўкове немцы з'явіліся, дзе што ў краме ў Урбаноўскага пазабіралі, а пасля туды людзі з вёскі схлынулі і рэшту разабралі. А пасля прыйшлі саветы; браму ім каля Ёсіпа зрабілі з дрэваў — яшчэ зялёныя былі — вярхі дрэваў звязалі і віталі хлебам і соллю.

І зараз амаль усе мужчыны — сорак чалавек — папісаліся ў міліцыю. І штодзень сходы і сходы. Далі ім карабіны, і адзін такі міліцыянер выйшаў з карабінам і стукае тым карабінам аб падлогу ў старой школе: „Гэты карабін будзе мне хлеб даваць, будзе мяне карміць!” А мой тата гэтую камуну ўжо ў Расіі бачыў пасля рэвалюцыі і кажа яму:

— А ты знаеш такую рускую пагаворку: „Хто скора палюбіць, той скора і разлюбіць”?

— А ты знаеш, што ты ў нас трэці на расстрэл? — пытае ён тату.

— Ну то страляйце, ці жя ўцякаю дзе, ці баюся? Расстраляеце, то раз.

Першымі ў спіску былі два бацюшкі Новікі, а мой тата быў трэці, бо псаломшчыкам быў. А пасля прыходзілі і перапрашалі майго бацьку: „Дзядзьку, мы не ведалі...”

Накладалі налогі без пачатку і канца. Ужо як пасля вайны былі налогі, то колькі прызналі, то столькі плаціў збожжа, картофляў і мяса, і грошы, і малако. А саветы — чым хто больш даваў, то ад яго тым больш трэбавалі. У Ляўкове сядзеў безупынна пракуратар, мусі з Гродна, і колькі каму ўздумаў, толькі ад таго патрабаваў. Бедны Вася Зялінскі то і не вылазіў з налогаў, толькі дахаты вернецца, не ўспее коней распрагчы, а ў яго ўжо зноў госць і зноў накладае на яго. Мучылі проста людзей. Дзесь за Свіслаччу аэрадром будавалі, то туды і каменне і пясок вазілі, мала людзі ў хаце сядзелі, усё налогі і налогі. І не было так, што адрабіў і канец. Адзін мужчына быў там і так сказаў:

— То я ўжо сваё выканаў і ўжо канец.

А савет падслухаў і зарагатаў:

— Будзе канец! Заедзеш дамой і апяць вернешся.

А як жа: заязджае дадому, а там яму кажуць:

— У нашей власти нет конца.

І вывозілі „ворагаў народа”: каваля з Новінаў, што там меў пару гектараў пяску, бо кулак. І крамніка Урбаноўскага вывезлі, бо ён тутэйшым таварышам таксама ворагам народа быў, бо багаты. І хаця добры для людзей быў, бо і каму было трэба, то і дапамагаў, то вывезлі і слых пра яго прапаў. А жыда з Нараўкі ніводнага не вывезлі, хаця яны прыгаршчы золата мелі. Усё залежала ад сваіх людзей, ад сваіх сабак. Вось за лесам прадседацель жыў, які калі нешта напісаў, то пасля паўгадзіны ўжо не ўмеў таго сабою напісанага прачытаць; такія людзі былі саветам патрэбныя, бо імі лёгка было кіраваць. І быў яшчэ адзін — сволач а не чалавек — што ён людзей вымучыў! Але як напалі немцы, то ён дзяцей на ровар пасадзіў і ўцякаў. Затрымаўся ён на дарозе, якою адступала савецкае войска і кажа:

— Товарищи, куда вы удираете? Надо родину оборонять!

А адзін рускі афіцэр выняў пісталет і кажа:

— А ты что за один? Шпион!?

І бах у лоб, і ўсё.

Сарганізавалі ў нас і калгас. Пасеяць і пасадзіць пасеялі, але сабраць калгаснікам ужо не давялося, бо ўспыхнула вайна; збіралі тыя, на чыім полі аралі і сеялі. А тых, што сталі на працу ў лесе, — шаснаццаць чалавек — у калгас не бралі. Мой брат Жорж таксама працаваў у лесе — стаханаўцам быў; стаханаўцам плацілі ўтрая больш; рублёў у іх было як паловы. За тыя грошы можна было ўсё купіць: і прадукты, і матэрыялы ў краме, што ў гаёўцы за Капітаншчынай была; там маглі купляць толькі сталыя лясныя рабочыя. А ў Ляўкове была крама, якую вёў Хведар Несцярук з Ахрымоў.

**Сакалоўскі Уладзімір, Сухінічы:**

Быў Сашка Віткоўскі з Кнышэвіч, ён склікаў у нас сход і абвясціў, што будзе савецкая ўлада. Выбралі новага солтыса і вясковы камітэт. Людзі самі выбіралі са сваіх, а той прадстаўнік зацвярджаў.

У апошні час прабавалі калхозрабіць. Паявіліся людзі з Расіі, упаўнаважаныя, якія націскалі на нашых людзей. Ічапляліся, абавязацельствы накладалі — збожжа вазіць, бо пагражалі карамі. Людзі баяліся вывазкі ў Сібір. Павывозілі багатых памешчыкаў, а баб аставілі; і Пракопчыкаў абоіх вывезлі. Усе маёнткі параздавалі тым, што хацелі. А вясковым не забіралі зямлі.

Арганізавалі школу і тых, што ў санацыйнай школе вучыліся, на адзін год вярталі — у ніжэйшы клас. Тыя вучыцелі, што пры Польшчы вучылі, як стала вайна, выехалі на сваю радзіму. Новыя настаўнікі вучылі па-руску і па-беларуску. З-за савецка-нямецкай мяжы ўцякалі яўрэйскія бежанцы і саветы іх тут затрымоўвалі і за чыноўнікаў і настаўнікаў паставілі. І ў нас траіх яўрэяў вучылі і адна настаўніца ад Польшчы асталася; разам у нашай школе вучыла чацвёра настаўнікаў.

**Сац Марыя, Чаромха-Станцыя:**

Пры саветах усіх вучняў у піянеры залічылі. Чырвоныя гальштукі выдалі. Забаранілі ў царкву хадзіць. За гэтым настаўнік фізкультуры назіраў. Калі падыходзіў час у царкву ісці, ён пад масцік хаваўся. Запісваў прозвішчы тых, хто на багаслужбу ішоў. Наступнага дня „выгавар” даваў.

**Свіцкі Яўген, Ячна:**

Як прыйшлі рускія, то іх ніхто ў нас не вітаў. У Ячне школу зрабілі ў парафіяльнай хаце. Настаўнічала маладая жыдоўка з Гродна і на-

стаўнік з нашай вёскі. Саветы ў нас да рэлігіі не ўмешваліся. У 1940 годзе ганялі людзей пад Ліпск і Каменную бункеры будаваць.

У Гродне войска многа было. Нашы свіней білі і ў Гродна вазілі. Пры ўездзе ў горад мяса штэмплявалі і пазней прадавалі. Плацілі 16 рублёў за худую саланіну і 18 рублёў за тоўстую. Гарэлка „Маскоўская” каштавала 16 рублёў за літр, пустая бутэлька — 1 рубель. 20 папяросаў каштавалі 80 капеек, а каробка запалак — 2 капейкі. Знойдзе які малы бутэлькі, прадасць і купіць папяросы з запалкамі.

Як настаў саветы, то ў Дуброве раён зрабілі. Сельсаветы ў Вастраве і Ружаным Стоку былі, у кожным сельсавеце — міліцыянер. Мае мамы сястра матэрыял суседу адступіла, а ён данёс, што спекулянтка. І пяць гадоў ёй засудзілі, а двое дашкольных дзяцей мела. І ў поезд ужо пасадзілі, але акурат успыхнула вайна, той поезд збамбілі і яна дадому вярнулася.

**Секаноўскі Барыс, Барысаўка:**

Сельсавет размясцілі не ў Ласінцы, а ў Крыніцы; старшынёю быў Сяргей Мінько з Гарадзіска (пасля немцы з маёнтку ў Ляўкове забілі яго каля Бярначчыны). Саветы намаўлялі ў калгасы, але людзям спешна не было. На сходзе адзін з гаспадароў сказаў агітатару: „Дзе б вароне не лятаць, усё раўно гаўно кляваць”, пасля, аднак, ужо ціха сядзеў. З нашай вёскі саветы вывезлі аднаго толькі гаёвага, які быў палякам.

**Семянюк Павел, Рэпіскі:**

Як поп свянціў паску, то пасля кожны мусіў у яго два дні на полі працаваць. Саветы папу поле забралі, гусенічным трактарам зааралі пасеў і сказалі:

— Хто пасеяў, той і пажне.

Як прыйшлі немцы, поп гаварыў:

— Да, уже красный зверь больше не вернётся сюда.

Калі за Васькамі немцы пабілі праваслаўных з наваколля Нарвы і ў Ласінцы дзевяць трунаў стаяла, поп гаварыў: „Красный уголок”, але пасля яго не чапалі.

Калі ўвайшлі першыя саветы, то старэйшыя вяскоўцы вынеслі стол, гарэлку, закуску паставілі. Адзін мужык, пабачыўшы танкі, здзівіўся:

— То и у вас танки есть?

— Да, — адказаў адзін з саветаў. — Поляки плесали танго, а мы делали танки и ваши поляки бегут.

Але зараз саветы загадалі па пяцьдзесят пяць кубікаў з лесу вывезці. І хто выразаў, той свабодны быў. А адзін, Манах з Ласінкі, сказаў саветам:

— Каб дзеньгамі заплацілі, то б вам нарэзалі, колькі хочаш.

То яго ноччу прыехалі і забралі. І прапаў ён.

Адзін чалавек у санацыю ў Амерыку выехаў, там цяжка працаваў, вярнуўся і не вельмі хваліў тую Амерыку. Калі пасля саветы гналі немцаў, той, пабачыўшы тушонкі, сказаў савецкаму афіцэру:

— Я в Америке видел такой завод, где коровы входят, а выходит тушонка.

А афіцэр адказаў яму:

— А у нас такой завод, что с тебя выйдет такой солдат как и я, а с охлапин ещё пограничная собака.

**Трахімчык Ян, Гарадок:**

Калі мне было чатырнаццаць гадоў, памёр бацька. Пацярпелі тады бяды — голаду і холаду. Пайшоў кароў пасвіць, два гады ў Пяньках пас. Потым падрос і мяне ў суконную фабрыку ўзялі; тут, у Гарадку, шэсць суконных фабрык было. Працаваў пры машыне, бо мне фабрыкант лягчэйшую работу даў, а як што цяжэйшае варочаць трэба было, то другія памагалі. Фабрыка працавала шэсць месяцаў і станавілася, бо збыту не было. Тады стаў я ў тартак, дошкі ў штэблі стаўляў, каб сохлі. Працаваў наперамен: то ў фабрыцы, то ў тартаку; так было да прыходу Чырвонай Арміі.

Нашу фабрыку падпарадкавалі 10-му Тэкстыльнаму камбінату ў Беластоку. Саветы ўсім далі работу. Калісь, як на сваёй машыне не было работы, то на другую ганялі, а пры саветах толькі сваёй машыны трэба было глядзець і людзям гэта падабалася.

**Харкевіч Аляксандр, Лешукі:**

У верасні 1939 года ўвайшлі да нас саветы. Мы, маладыя, падаліся на чыгуначную станцыю ў Нараўку вітаць іх. Прыехаў паравоз з вялікай чырвонай зоркай наперадзе. Салдаты даюць нам курыць:— Держи шапку! Насыпалі жменю адну, другую. Мы даем ім „бумажки”, паглядзелі яны на іх і кажуць:

— В это не свернём.

І завярнулі тытунь у газеты. Сказалі нам, што ў Ваўкавыску адбудзецца авіяпарад. Дык мы селі на поезд і паехалі ў Ваўкавыск. У першым класе і без білета, бо ж уяўлялі сабе, што пры саветах плаціць не трэба. А ў Ваўкавыску нас арыштавалі, але зараз і выпусцілі. Выйшлі на

горад, ніякага параду няма, затое па вуліцах ступаюць жыды з чырвонымі бантамі і запрашаюць каб далучыцца да іх. Пайшла чутка, што той парад адбудзецца ў Беластоку і некаторыя з нашых паехалі ў Беласток.

У саракавым годзе пачалося раскулачванне тых, што мелі больш за дзесяць гектараў зямлі. У мяне былі тры каровы і бычок. Прыйшоў да мяне „председатель" і заявіў, што майго бычка трэба здаць у Ваўкавыск, у падарунак таварышу Сталіну. Назначылі фурмана з фурманкай і яшчэ хлапчука, каб паганяў. Вывелі яны таго бычка за вёску, а ён фурманку вывернуў. Пасходзіліся людзі і неяк тую фурманку наладзілі. Бычка здалі, але ніякіх грошай за яго мне не вярнулі.

Неўзабаве загадалі мне здаць карову; павёў я яе цяпер сам у Свіслач. Павёў я сваім канём. У Свіслачы калейка! Падышоў да мяне чалавек, распытаў адкуль я і кажа:

— Ідзіце за Свіслач, там загарада з каровамі, ніхто іх не корміць...

Заглянуў я туды, а там ужо дваццаць восем кароў здохла. І зноў усе каровы, што ў той дзень пабралі, загналі ў тую загараду.

У Луку савецкія начальнікі прыехалі выбіраць старшыню сельсавета і заявілі, каб гэта быў „лучший из лучших". А людзі ведаюць, што яны багатых не любяць і запрапанавалі двух братоў Новікаў; кожны з іх меў па тры гектары. Пытаюць начальнікі першага:

— Сколько земли?

— Тры гектары.

— Что держишь?

— Тры авечкі, каня, карову і цялушку.

— Садись. А у тебя сколько? — пытаюць другога.

— Тры гектары.

— А что держишь?

— Ничего.

— Вот каких нам нужно — это лучший из лучших!

І выбралі яго.

Другім разам прыехаў да нас нейкі начальнік з Мінска пабачыць, як у нас людзі жывуць, і даведаўся, што адзін гаспадар здае ў малачарню сорак літраў малака.

— То у вас такая сволочь есть, что сорок литров один сдаёт!?

**Харытанюк Мікалай, Паўлы:**

Калі рускія ўвайшлі сюды ў трыццаць дзевятым годзе, то так, як і ў іншых раёнах, арыштавалі ўсіх багацейшых людзей. Што з імі было далей, ніхто не ведаў. Казалі, што павезлі ў Сібір. Адзін тут меў краму, дык забралі яго, і жонку, і брата, а дзяцей яны не мелі. Слух па

іх загінуў. А былі гэта добрыя людзі. Маленькая крамка, ніхто нікога не эксплуатаваў, самі працавалі.

Ад нас узялі тады Ільlю Грыбоўскага, з якім жыла мая бабуля. А прыехалі яны ў Паўлы з Грыбоўшчыны, бо думалі, што тут будзе спакайней. Прапаў след, як і па Нічыпару з крамы.

Які быў настрой у людзей? Большасць радавалася. Моладзь пачала вучыцца па-руску і па-беларуску. Пабудавалі школу, перавезлі будынак з-пад Жэдні. І я пайшоў ізноў у другі клас. Але зрабілі калгас — і частка людзей не была гэтым захоплена. У калгас яны не пайшлі.

**Хмялеўскі Ян, Паўднёвы Востраў:**

Саветы нікога не вывезлі, але даваенныя падпольшчыкі сабраліся і напалі на надлясніцтва. Надлеснаму ўдалося ўцячы, але яны забілі ягоную жонку і трое дзяцей. І ў Паўночным Востраве дваіх забілі; адзін з іх быў да вайны солтысам і, мабыць, даносіў на падпольшчыкаў паліцаям. Пасля саветы двух тых, якія стралялі да ахвяр, кудысь вывезлі і яны ўжо не вярнуліся. Саветы сказалі, што ёсць „власть”, якая разглядае правіны, а самасудаў рабіць нельга. А ўсіх тых, якія памагалі ў забойствах, не чапалі.

Сельсавет быў у Грыбоўшчыне, у вялікай хаце пры царкве; царкву паставіў Ільля Клімовіч, а хату парафія пабудавала. Старшынёй сельсавета выбралі Налівайку з Новай Грыбоўшчыны; яго пасля немцы забілі. А міліцыянер пры сельсавеце быў з Вярхлеса — яго ў 1946 годзе банда забіла.

Пры саветах дысцыпліна вялікая была. Мусова было лес рубаць і для высечкі адусюль людзей прыганялі. Зімою 1940 года, якая была вельмі лютая, у нашай хаце начавала дзевяць чалавек. А куды той лес вазілі: ці немцу, ці ў Расію — невядома.

Хацелі ў нас арганізаваць калгас, але не ўспелі. А ў Лешчаной, Гаркавічах і Слоі зрабілі.

**Храноўскі Анатоль, Гарадок:**

Да вайны мае бацькі гаспадаркай займаліся, працавітыя былі, коней і кароў трымалі, адзецца мелі ў што. Як прыйшлі саветы, то нашых, беларусаў, васемнаццаць чалавек падпісаліся, каб нас вывезці; рускія ў гэтым невіноўныя. Бацьку забралі тады, калі вывозілі працаўнікоў польскай адміністрацыі.

Да нас прыйшлі ноччу, месяц пазней. Сказалі: „Сабірайцесь, паедзеце да бацькі!” Нічога не дазволілі забраць з сабою, толькі падушку адну на дваіх і накрыццё — таксама адно на дваіх. Забралі нас у сама-

ход, каб ніхто не бачыў, і ў Жэдню завезлі. Калі я аглянуўся, то ўжо суседзі па хаце хадзілі і разбіралі тое, што асталося.

Пагрузілі нас, маму, мяне, сястру і брата, у цялячыя вагоны і павезлі ў Сібір. Ехалі паўтары або два месяцы, завезлі ў Паўночнаказахстанскую вобласць на станцыю Жалтыр. Пасля года перавезлі нас у Акмолінскую вобласць. Малодшыя брат з сястрою ў школу пайшлі, а мяне заставілі нівеліраваць зямлю пад чыгунку. Калі я сказаў, што таксама ў школу хачу, мне адказалі, што нас прывезлі работать. Будавалі чыгунку і ўсялякія работы рабілі, збожжа на вагоны грузілі. Летам у палатках жылі, а зімою ў зямлянках. Ежы было мала і тая на талоны была. У сталоўцы з кухняй картку адрэжуць і дадуць есці.

**Ціванюк Сяргей, Ціванюкі:**

Як прыйшлі саветы, у лістападзе прынялі мяне ў Беласток на чыгунку. На гаспадарцы асталіся маці з сястрою, а я хацеў лепш зарабіць і нейкія веды мець. Два тыдні быў на курсах сцэпшчыкаў вагонаў, а пасля ездзіў на таварных паяздах у Гродна, Ломжу, Чаромху, Гайнаўку, Лапы. Так было да мая 1940 года, калі я пайшоў на шасцімесячныя курсы дыспетчараў і начальнікаў станцый у чыгуначнай школе ў Беластоку.

Пасля вучобы пайшоў на двухтыднёвую практыку ў Старасельцы, але быў там толькі адзін тыдзень, бо пазвалі мяне ў ваенкамат. Запрапанавалі на чатыры гады ў войска, вучыцца. Я згадзіўся і паехаў у Мічурынск, у 8-мы Асобы чыгуначны полк. Навучалі там чатыром спецыяльнасцям: будове мастоў, пуцей, паравозаў і вагонаў. Я выбраў будову мастоў, бо цесляром быў — добра сякерай валодаў. Тры месяцы адбывалі вайсковую службу, да прысягі ў снежні 1940 года. А пасля ўжо вучыліся ў школе, але ў вайсковай форме.

У маі вывезлі нас на практыку ў горад Ільіна, 500 кіламетраў за Масквою. Там мы мелі будаваць 80 кіламетраў пуці з Ільіна ў Горкі. З прычыны маразоў мы не маглі рабіць, а апрача таго сыра там было і ад камароў нас 80% захварэла на ліхарадку. Адтуль у канцы мая вывезлі нас на Украіну, на станцыю Вапенна каля румынскай граніцы. Прабылі там чатыры дні і ўспыхнула вайна. Мы два тыдні трымалі абарону на граніцы, а пасля эвакуіравалі нас у Мічурынск. І як прыехалі, то ўжо нашага старога войска не было, толькі маладыя. Быў там сарганізаваны 2-гі запасны батальён, у складзе якога эвакуіравалі нас адтуль. Пехатою ішлі праз Тамбоў і Пензу. У Пензе, пасля 7 лістапада адстаялі мы два дні, падставілі вагоны і нас пад канец студзеня завезлі ў Арэнбург.

Размеркавалі нас па гаспадарах. Капалі катлаваны пад фабрыкі, якія эвакуіравалі з захаду. Станкі ставілі пад голым небам і запускалі, толькі пасля рабілі „скросы” і накрывалі. Былі там да сакавіка, тэмпература падала там да 52 градусаў марозу. У сакавіку 1942 года вывезлі нас у Чэлябінск, а ў красавіку ў дапаможную гаспадарку ў саўгас Эсаулку. Раззброілі нас і раздзялілі на некалькі груп; нас было 26 чалавек. Будавалі там „овощехранилище” на 300 тон бульбы, а ў кастрычніку зноў у Чэлябінск вярнулі — у 72-гі ваенны завод. Пражылі там два тыдні ў зямлянках, а пасля сталі набіраць на працу. Далі нам анкеты, дзе трэба было напісаць, хто адкуль. І пасля нас усіх, чые тэрыторыі апынуліся пад немцамі, выкінулі з фабрыкі; было нас такіх 120 чалавек. І так, адкінутыя, пражылі мы да красавіка 1943 года. Харчаваліся абы толькі пражыць — 600 грамаў хлеба ў суткі і раз суп. А хто працаваў на заводзе, той харчаваўся ў сталоўцы тры разы ў дзень і атрымоўваў 800 грамаў хлеба.

У красавіку 1943 года сталі набіраць нас у калгасы, на палявыя работы. Нас дваццаць чалавек, у тым ліку з Беластока, Чыжоў і Катлоў, завезлі 18 кіламетраў за Чэлябінск у завадскую дапаможную гаспадарку „Красное поле”. Дзевяць чалавек атрымала працу ў сталярні, у іх ліку я і Вася Філіманюк з Чыжоў. Рабілі вазы і колы, а Вася — вокны і дзверы. Жылі ў бараках, кармілі нас у сталовай, добрыя абеды давалі, а кашы было — колькі хочаш есці! Восенню мяне назначылі брыгадзірам.

У ліпені 1944 года, калі рушыў фронт, падпалі мы пад мабілізацыю. Прабыў я ў арміі да красавіка 1946 года, калі мяне здэмабілізавалі; разам з калегам з Трасцянкі Федзем Семянюком. Я запісаўся палякам, а палякаў звальнялі. Прыехаў дадому. Былі там мама з сястрою ў паваленай хатцы. І ўсё!

**Шайкоўская Марыя, Орля:**

Быў 1941 год. Мае бацькі, Марыя і Уладзімір Врублеўскія, мелі 24 гектары зямлі, коней і статак кароў і за гэта 20 чэрвеня гэтага ж года НКУС саслаў маці, мяне і 10-гадовую сястру Любу ў Сібір — у мясцовасць Айрот-Тура (цяпер Горна-Алтайск). Бацьку месяц раней прызвалі ў Чырвоную Армію.

У Алтайскі край везлі нас два тыдні. Эшалон з 57 таварных вагонаў цягнулі два лакаматывы. У вагонах ехалі разам жанчыны, дзеці і мужчыны. Спалі мы на збітых з дошак нарах, а апаражняліся цераз дзіру ў падлозе. Акенца ў вагоне было закратаванае, а дзверы канваіры зачынялі звонку. Па дарозе, а праехалі мы 5 тысяч кіламетраў, толькі не-

калькі разоў давалі нам кіпяток і трохі хлеба. У гэтым эшалоне былі яшчэ яўрэй Бархат з Бельска (меў краму з вопраткай насупраць ратушы), сям'я Паўлючукоў з Мора, настаўніца Марыя Врублеўская з Орлі (з дзецьмі Данусяй і Веськам).

Год жылі мы і працавалі ў саўгасе. Пасля перанеслі нас у горад Айрот-Тура. Маці стала працаваць швачкай — шыла кажухі і рукавіцы на фронт. Харчы можна было купіць толькі па талонах. Дзецям належалася 300 грамаў хлеба на дзень, а рабочым — 800. Была гэта, уласна кажучы, асноўная ежа.

Мы з сястрою хадзілі ў школу. У 1943 годзе з выдатнымі адзнакамі закончыла я дзесяцігодку і атрымала накіраванне ў ваенную акушэрска-фельчарскую школу. Мела я стаць медсястрой, а гэтая прафесія карысталася тады папулярнасцю. Са школьнага жыцця запамятаўся мне такі эпізод. Мясцовая школьная сяброўка, каб дакучыць мне, абазвала мяне словамі „ты, палячка!". Не ведаю хто аб гэтым данёс кіраўніцтву школы, але вызвалі яе ў канцылярыю і правучылі. У школе абавязвала камсамольская форма і дысцыпліна. На экзаменах перад ваеннымі настаўнікамі адказвалі мы ў стойцы „зважай".

Усе цэрквы былі там закрыты і перароблены на склады. Святароў перавялі на працу ў школе ў якасці свецкіх настаўнікаў. Калі на ўроку біялогіі на пытанне пра ўзнікненне чалавека адказала я, што стварыў яго Бог, настаўнік выклікаў мяне ў канцылярыю і доўга размаўляў са мною на розныя тэмы. Была я здзіўлена яго сардэчнасцю і не разумела, што магло быць прычынай такога стаўлення настаўніка да маёй асобы. Толькі пасля вяртання ў Польшчу з ліста я даведалася, што настаўнік Аляксандр Іванавіч раней быў бацюшкам.

9 мая 1945 года трэба было мне здаваць дыпломны экзамен. На калідоры наш ваенрук (ваенны кіраўнік) схапіў мяне, тройчы падкінуў угару (важыла я тады 49 кг) і сказаў: „Маруся, победа за нами! Сегодня экзамена не будет, завтра будет". Пасля заканчэння школы, са жніўня 1945 да 15 красавіка наступнага года працавала я ў мясцовым шпіталі. Часта вазілі мы хворых у бальніцы Новасібірска, Омска і іншых гарадоў.

Вярталіся мы таксама ў таварных вагонах, але на лакаматыве лунаў ужо бела-чырвоны сцяжок. Дзвярэй вагонаў канваіры ўжо не пільнавалі. У Маскве стаялі мы два дні. Быў у нас запас харчоў, у тым ліку і амерыканскі сыр. Разам з намі ехала 1 200 яўрэяў. У ссылцы былі мы пяць гадоў. Увесь гэты час не мелі мы вестак ад бацькі. Сустрэліся з ім ужо ў Польшчы.

**Шакала Люба, Арэшкава:**

Як прыйшлі саветы, мяне ў Брэст на курс сакратароў і старшынь сельсаветаў паслалі. Пасля сакратаром у Белай (зараз у Беларусі) назначылі. Там да вайны працавала. Старшынстваваў нашай управе Максім Марчук. Вельмі начытаны быў ды спагадлівым чалавекам лічыўся. Народ яго выбраў. Хваравіты быў, прыкульгваў крышачку.

Сельсавет у Белай займаў тэрыторыю больш дзесяці вёсак. У наваколлі шмат лесу было. Зарабіць нейкі грош магчымасць была. Прыбытак з працы людзі мелі. Мо таму і лепш чым у Арэшкаве жылі. Пазней калгасы арганізавалі.

KAMUNIKAT.org